Vrublevskio biblioteka

ŠALTINIS
Krynica
Biełaruskaja Narodnaja Hazeta
Vychodzić u aŭtorki i piatnicy.

№ 55 (764).
Cana 10 ct.
VILNIA, 12.VII.1940h.
Hod vydańnia XXII

Padpiska na hod — 5 litaŭ, na paŭhoda — 3 lity.
Zahranicu — ŭdvaja daražej.
Abviestki: za 1 mm u tekšcie 40 ct., za tekstam 30 ct.

Adresas red.-adm.: Vilnius, Pylimo g-vė 1—2, tel. 28-32
Adres red. i admin.: Vilnia, Zavalnaja vul. 1—2.
Redakcyja i administracyja adčyniena 10—14 hadz.
Redaktar pryjmaje 15—16 hadz.

14 lipnia vybary ŭ Sojm Litoŭskaj Respubliki

Kožny hramadzianin u hety dzień pavinien paśpiašyć da vybarnych urnaŭ i spoŭnić svoj hramadzki abaviazak!

Na vybary, na hałasavańnie!..

Hazety, radyjo i tak ludzi adny adnym raźnieśli viestku pa ŭsiej Ličvie ab vybarach u Litoŭski Sojm u hetu niadzielu 14 lipnia. Usie my vilency dobra pamiatajem polskija panskija vybary, jakija adbyvalisia pad prymusam, na kandydataŭ jakich vystaŭlała palicyja i polskija pany. Narod pieravažna ŭciakaŭ ad takich vybaraŭ i chavaŭsia.

Tak napryklad u Słonimskim paviecie apošnija panskija i čynoŭnickija vybary biełaruskija sialanie i rabotniki susim byli zbajkatavaŭšy i ŭ dzień vybaraŭ chavalisia pa lasoch, pa chlavoch i humnach, abo prytvaralisia chvorymi. Palicyja tajnaja i jaŭnaja jeździła pa siołach i siłaj ich zahaniała na hałasavańnie. Hetkim čynam udałosia sahnać tolki piać pracentaŭ majučych prava hałasavać. Ale heta ničoha. Čynoŭniki i pany, na čale sa starastam, patrebny lik hałasoŭ padsypali i vyjšla tak, jak treba było. Hetak biełarusy adnosilisia da panskich ašukanskich vybaraŭ.

I heta susim zrazumieła. Pry tahočasnych abstavinach ničoha inšaha im nie astavałasia. Ale heta śviedča ab vialikaj hramadzkaj śviedamaści słonimskich biełarusaŭ. Niamienš hetaj śviedamaści majuć biełaruskija i ŭsie inšyja sialanie i rabotniki Vilenščyny. Voš-ža vierym, što jany pojduć da urny na vybary, hałasujučy na tych kandydataŭ, jakija najbolš adkazvajuć patrebam šyrokich rabotnickich i sialanskich pracujučych masaŭ.

Nia budziem tut havaryć ab miescy, paradku i sposabie hałasavańnia. Ab hetym pišycca na inšym miescy našaj hazety. A tut jašče krychu zatrymajemsia nad patrebaj i nieabchodnaściaj hałasavańnia. Hetaja-ž patreba i nieabchodnaść datyča sapraŭdy ŭsich pracujučych hramadzian.

Musić iści na hałasavańnie kožny rabotnik, bo-ž maje jon dobruju nahodu i abaviazak padtrymać i vybrać tych kandydataŭ u pasły, jakija jduć tudy pad kličam baranić pravy rabotnika i budavać spraviadlivuju, apiortuju na pracy, Respubliku pracoŭnych.

Musić iści na hałasavańnie kožny sielanin, bo-ž sialan u Ličvie najbolš, i treba, kab jany padtrymali i vybrali tych kandydataŭ, jakija znajuć ich patreby, sami časta z sialan pachodziać i jakija tam u sojmie buduć pracavać nad zakonami, kab sialanie, jak asnaŭnaja i hałoŭnaja asnova Litoŭskaj Respubliki, mieli adpaviednaje značeńnie, škoły ŭ rodnaj movie, pravy i sapraŭdnaje žyćcio. Kali-b jaki pasoł sprakudziŭsia, dyk pavodle vybarnaha zakonu vybarcy takoha niaŭdałaha i drennaha pasła majuć prava adklikać.

Musiać paśpiašyć na vybary i ŭsia pracoŭnaja intelihiencyja. Kažuć, što intelihiencyja — heta mazhi narodu. Peŭnie što tak, kali henyja mazhi majuć mahčymaść i achvotu ruchacca i pracavać dla dabra narodu. Voš-ža kali da hetaj pary hetaj intelihiencyi ahułam, a prad usim intelihiencyi biełaruskaj, było ciesna, dušna, chałodna i hałodna, dyk ciapier treba staracca hetuju mahčymaść naležna vykarystać. A vykarystać hetuju mahčymaść možna prad usim hałasujučy ŭ niadzielu na kandydataŭ, jakija sami pierajšli henuju ŭspomnienuju moralnuju i fizyčnuju duchatu i jakich zadańniem budzie kłapacicca ŭ Sojmie ab toje, kab henyja intelihiencyja mazhi vyjšli z zastoju i raskładu i pačali enerhičnuju pracu na karyść pracoŭnych, na karyść Litoŭskaj Respubliki Pracy.

Słovam, u niadzielu 14.VII usie hramadzianie na vybary, usie na hałasavańnie! Supolnymi siłami da supolnaha śvietłaha žyćcia!..

M. K.

JAK, DZIE I KALI HAŁASAVAĆ

Pryhatavańni da vybaraŭ u Sojm iduć poŭnaj paraj. Pa ŭsiej Ličvie ŭ roznych miascoch adbyvajucca roznyja mitynhi, sabrańni, na jakich narodnyja masy vyjaŭlajuć vialikaje zacikaŭleńnie vybarami ŭ Sojm i svajo padtrymańnie dla Sajuzu Pracoŭnych Litvy. Ter min vybaraŭ užo staić pierad nami i 14 lipnia ŭ niadzielu kožny hramadzianin paśpiašyć da vybarnych urnaŭ, kab spoŭnić svoj hramadzki abaviazak. Dziela taho na časie budzie prypomnić, dzie, jak i kali treba hałasavać.

Vybary pačnucca 14 lipnia a hadzinie 8 ranicy i buduć tryvać najmienš da hadziny 20-taj viečara hetaha dnia. A hadzinie 8 buduć užo adčynieny ŭsie rajonnyja vybarnyja akružnyja kamisii, u jakich treba budzie addavać hałasy. Hałasavać možna tolki ŭ tej rajonnaj kamisii, na abšary jakoj žyvieš Miesca rajonnych kamisijaŭ i ichni abšar abvieščany specyjalnymi abviestkami. Kali vybarščyk u časie hałasavańnia znachodzicca ŭ inšaj miascovaści, dyk hałasuje ŭ henaj vakolicy, dzie znachodzicca ŭ hetym časie. Stojačy prad vybarnaj kamisijaj i urnaj, treba mieć dakumant, śćviardžajučy prava da hałasavańnia. Dakumantami hetymi žjaŭlajucca litoŭski paš part, abo „svietimšalio liudijimas“, h. zv. dakumant dasiulešnich „čužaziemcaŭ“. Kali chto nia maje hetych dakumantaŭ, a žyŭ u Vilni ci jaje vokruhu prad 1.IX.1939 h., moža atrymać specyjalnaje paśviedčańnie, upavažniajučaje da prava na hałasavańnie. Paśviedčańni hetyja vydajuć kamisaryjaty palicyi i ŭ pamieškańniach Akružnych Vybarnych Kamisijaŭ ad 11 da 13 lipnia ŭ časie ad 8 da 14 i ad 15 da 20 hadziny na asnovie: a) chatniaje meldunkovaje knihi, abo b) vypiski z meldunkovaje knihi paćvierdžanaje praz natarusa, abo kamisaryjat palicyi.

Hałasavańnie budzie adbyvacca pry pomačy kartačak, na jakich buduć nadrukavany proźviščy kandydataŭ u pasły i chto ich vystaviŭ. Kartački henyja i kanvert vydaść rajonnaja kamisija kožnamu hałasujučamu. U kanvert treba kłaści hetulki kartak, kolki jość kandydataŭ u vokruhu Kali kartačak budzie bolš jak kandydataŭ, tady hołas niavažny, a kali kartačak budzie mienš jak kandydataŭ, tady budzie hołas važny i tolki za tych kandydataŭ, z katorych proźviščami buduć kartački. Ułažyŭšy kartački ŭ kanvert, treba jaho zakleić i padać u kamisiju, jakaja zrobić na da kumancie śćviardžajučym prava da hołasu adpaviednuju adnatacyju ab tym, što vybarny hramadzki abaviazak spoŭnieny.

Hałasujcie na kandydataŭ ludziej pracy!

З Выбарнай Плятформы Саюзу Працоўных Літвы

Шырокія народныя масы Літвы на выбары ў Сойм ідуць у Саюзе Працоўных Літвы, аб якім мы ўжо пісалі ў апошнім нумары. Цяпер яшчэ шырэй хочам пазнаёміць нашых чытачоў з Саюзам Працоўных Літвы і ягонай плятформай, хкую падаём ніжэй у галаўнейшых яе частках.

Грамадзяне і грамадзянкі вызваленай Літвы!

У гістарычны дзень 14 ліпня пойдзем ўсе шчыльнымі радамі да выбарчых урнаў і выбярэм годных прадстаўнікоў народу, якія будуць сапраўднымі выразіцелямі народных жаданьняў, яго імкненьняў да замацаваньня і расшырэння шчырай прыязьні з вялікім Саюзам Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, які зьяўляецца адзінай гваранцыяй росквіту і свабоднага развою нашага краю.

Клічам усіх чэсных грамадзян і патрыётаў нашага краю, усіх выбаршчыкаў, бяз розніцы нацыянальнасьці і веравызнаньня на галасаваньне толькі за тых кандыдатаў, каторыя будуць консэнквэнтна і стойка змагацца за наступныя жаданьні нашай плятформы, згоднай з патрэбамі працоўнага народу Літвы:

А) У галіне вонкавай палітыкі:

Дружба Літоўскай Рэспублікі з Савецкім Саюзам і трывалы, неразлучны саюз Літоўскай Рэспублікі з Саюзам Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Б) У галіне ўнутранай палітыкі:

1. Скасаваць працоўным сялянам усе старыя незаплочаныя падаткі і даўгі, а таксама ўсялякія штрафы.
2. Скасаваць банковыя даўгі незаможным і малазямельным сялянскім гаспадаркам.
3. Усебаковая дзяржаўная помач беззямельным і малазямельным сялянам, а таксама надзяленьне іх зямлёй.
4. Палепшаньне становішча работнікаў і працаўнікоў цераз падвышку платы і палепшэньне варункаў працы.
5. Увядзеньне соцыяльнага забесьпечаньня працоўных ад хвароб і няшчасных выпадкаў на кошт прадпрыемцаў або дзяржавы.
6. Забясьпечаньне старых работнікаў, работніц і інвалідаў працы на кошт дзяржавы.
7. Расшырэньне ахновы здароўя народу — расшырэньне прэвэнторыяў, сеткі шпіталяў, санаторыяў і амбуляторыяў.
8. Усебаковы развой народнай культуры, мастацтва навукі і народнай асьветы.
9. Поўнае зраўнаваньне ў правох усіх народнасьцяў і свабода веравызнаньня.
10. Далейшая дэмократызацыя народнай арміі.
11. Забяспечаньне свабоды слова, прэсы, сабраньня і таварыстваў для абароны інтарэсаў працоўных.
12. Увядзеньне цывільнай мэтрыкацыі.
13. Нятыкальнасьць асобы і маемасьці грамадзян.
14. Стрыманьне выплаты запамогаў і эмэрытуры багатым і ворагам народу, скасаваньне асабістых дадаткаў, выплачываных вышэйшым урадоўцам, а таксама абніжэньне надмерна высокіх пэнсыяў вышэйшым урадоўцам,
15. Абніжэньне заплатаў за памешканьне і ахова правоў незаможных кватарантаў.
16. Барацьба са спэкуляцыяй.

Грамадзяне і грамадзянкі вольнай Літвы!

Клічам вас да галасаваньня за лёзунгі „Саюзу Працоўных Літвы", бо толькі праз спаўненне гэных жаданьняў народ Літвы асягне свае правы і шчасьце.

Аніводнага голасу за людзей, каторыя ня здольныя або ня хочуць консэквэнтна і з рэволюцыйнай стойкасьцю змагацца за лёзунгі „Саюзу Працоўных Літвы".

Ворагі народу Літвы і іхнія падхалімы, староньнікі старога рэжыму распаўсюджываюць розныя правакацыйныя пагалоскі аб прасьледаваньні веруючых людзей, аб закрываньні гвалтам касьцёлаў, аб маючым быццам наступіць прымусовым арганізаваньні калгасаў у вёсках і г. д. Пагалоскі гэтыя зьяўляюцца беспадстаўнымі выдумкамі.

Распаўсюджываюць іх з мэтай разбіцьця еднасьці работнікаў і сялян Літвы, стварэньня сярод народа недавер'я да новага жыцьця і павароту старых зненавіджаных парадкаў. Ня верце гэным пагалоскам, бязлітасна выкрывайце паклёпнікаў і правакатараў. Узмацняйце еднасьць і магутнасьць народу Літвы ў яго барацьбе за новае жыцьцё, за роўнае і стойкае зрэалізаваньне жаданьняў народу, прадстаўленых у плятформе „Саюзу Працоўных Літвы".

Усе як адзін на выбары новага Сойму!

Галасуйце на кандыдатаў „Саюзу Працоўных Літвы"!

Хай жыве магутны, неразлучны саюз работнікаў, сялян і працоўнай інтэлігенцыі нашага краю!

Хай жыве свабодная Літва!

Хай жыве брацкая дружба і магутны саюз з вялікім, неперамокным Саюзам Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

За мір, за вольнае развіцьцё народаў, за гаспадарчы пад'ём нашай бацькаўшчыны!

Выбарную Плятформу Саюзу Працоўных Літвы падпісалі:

Прадстаўнікі агульнага сходу работнікаў, работніц і працаўнікоў фабрыкі „Сільва": Лукашэвічіене, Каблеліс, Палюконене.

Ад імя работнікаў і работніц фабрыкі панчох „Діана": Леінас, Глікаіте, Сабунаіте.

Працаўнікі сходу работнікаў фабрыкі „Вэрполіт": Сеснавічуте, Рудінскаіте.

Прынята на агульным сходзе навуковых працаўнікоў, культурных дзеячоў і артыстаў. Подпісы: праф. В. Біржышка, Шальчюс, *доц.* Гірдзіяускас, *пісьменьнікі:* С. Чюрлёнене, Д. Вянцлова, П. Цвірка, Л. Гіра, К. Корсакас. Л. Довідюнас, С. Няріс, К. Бінкіс, К. Борута, П. Едяліс, И. Бутенас, Рукас, Ластас;

скульптары: Мікенас, Строліс;

мастакі: Ушінскас, С. Жукас, Калпокас, Гудайтіс, Візгірда, Булака, Мацкевічіус, Кузмінскас, Трэчіокаіте;

артысты: Качінскас, Мажэйка, Грыбаўскас, Кубэртавічіус. Юхневічіус, Кумантаіте-Грігараускіене, Лукашіус;

аграномы: Жабенко, Шкляріс, Жукаўскас;

інжынеры: Колодный, Алпеdo равічіус, Ляуданскіс;

вучыцялі: Жіугжда, Ругас, Бусілас, Зімонас;

журналісты: Шімкус, Мешкаўскене, Меравічіус;

бугальтар: Романаускас;

праўнік: Ковальскіс *і інш. (98 подпісаў.)*

Аднагалосна прынята на сходзе сялян вёскі Кунігішкі, пав. Ракішкі, на якім узяло ўдзел 100 асоб. Подпісы.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнага Саюзу Моладзі Літвы.

Прадстаўнікі сходу работнікаў ткацкай фабрыкі „Шілкас". Подпісы: Бершкуте, Ітэрсполіс, Салтонене.

Ад імя работнікаў бровару А. С. „Волфас-Енгелманас" сябры фабрычнага камітэту: Бэлінскас, Варнікас, Полінавічіус, Шленкутіс, Буткявічіус, Парушаітіте.

Прадстаўнік сходу работнікаў і работніц ткацкай фабрыкі „Коттон" І. Сімонас.

Прадстаўнікі цэнтральнага бюра профэсыянальных саюзаў: М. Шумаўскас, В. Лукашевічіус, А. Буткус.

З Таварыства Лекатараў: Жукаускас, др. Гармус, Жукас, *пісьменьнік* Юозенас-Балтусіс, *бугальтар* Фактараускас, *кравец* Чюжас, *работніца* Навідаіте.

Прадстаўнікі сходу работнікаў і працаўнікоў фабрыкі шкла „Алексотас": Ф. Сгірскаіте, Прашкевічіус, Богдановічіус.

Прадстаўнікі сходу сялян вёскі Гэрмолаі, Пустанішкіс і іншых, троцкага павету: Лепоніс, Мітраускас, Нерэвес.

Прадстаўнікі сходу работнікаў і работніц (300 асоб) А. С. „Кауно-Аудініаі": Чапкаускас, Будрейка, Шаукаускене, Буроkіене, Міколаускас, Жілінскас.

Управа Саюзу Вольнадумцаў: Мацкевічіус, Жулкес, Степонавічіус, Руткевічіуте, Барткус, Галоўне.

Прадстаўнікі работнікаў і работніц фабрыкі „Аудімас": Марцінкевічюте, Лінкаускас, Граявас.

Ад імя Управы Саюзу Помачы Будовы Літвы: Грынбергаіте, Домеікіене, Абрамавічіус, Пікаіте, Меігеліте, Мітkаускене, Мешкаускене *ады* Зімонас.

Прадстаўнікі сходу работнікаў і работніц ткацкай фабрыкі „Плуоштас": Артеновас, Павлаускіене, Рупкуте.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Літвы.

Hramadzianie! Usie hałasujce na kandydataŭ Sajuzu Pracoŭnych Litvy!...

Kandydaty Sajuzu Pracoŭnych Litvy ŭ Vilenskim vokruzie

Didžiulis Karol — nar. ŭ 1894 h., u Šavielskim vokruzie, u sialanskaj siamji. U palityčnym žyćci biare ŭdziel ad 1919 h. Za palityčnuju pracu, u jakoj imknuŭsia da vyzvaleńnia ludziej pracy, Didžiulis siadzieŭ u vastrozie, byŭ vysieleny i praśledavany. U apošnim časie naznačany paŭnamocnikam Uradu na Vilniu i vilenski vokruh.

Paškievič Jan—nar. ŭ 1892 h. u Vilenščynie, bielarus. Baćki mieli 3 ha. ziamli, nia mohučy prakarmić celaj siamji. Ad moładaści pracuje na svajo ŭtrymańnie.

Jendrychovski Ściapan — naradziŭsia ŭ 1910 h. u Varšavie, syn chimika i narodnaj vučycielki. Ad 1912 h. žyŭ i vučyŭsia ŭ Vilni. U studenckim žyćci (praŭnik) vostra vystupaŭ procių antysemickich burdaŭ i procių relihijnaha prymusu dla niavierujučych. U 1932 h. akančalna sarvaŭ z uradavym abozam u Polščy, kab brać dziejnaje ŭčaście ŭ antyfašystaŭskim ruchu. Ad henaha času ŭ vyniku svaje dziejnaści nia moža znajści stałaje pracy i zarablaje časovymi navukovymi pracami, specyjalizujučysia ŭ palityčnaj ekanomii i skarbovaści. Napisaŭ rad pracaŭ. Ad 1934 h. spatykajecca z palicyjnymi represijami. U 1935 h. aryštavany byŭ u słaŭnaj spravie „adzinaccacioch" i abvinavačany ŭ prynaležnaści da kamunistyčnaj partyi. Z pryčyny niastačy dokazaŭ byŭ apraŭdany. U 1937 h. byŭ razam z Dembińskim i Žeromskaj aryštavany za publicystyčnuju i antyfašystoŭskuju dziejnaść i zasudžany na 4 hady vastrohu. Apraŭdany ŭ apelacyi, adnak z pryčyny kasacyi prakuratara astaŭsia pad abvinavačańniem až da vybuchu imperyjalistyčnaj vajny, u času jakoj u Vilni zdabyŭ stupień doktara praŭ i vykładaŭ palityčnuju ekanomiju ŭ U.S.B.

Ab S. Jendrychoŭskim treba jašče skazać, što jon u svajej publicystyčnaj, hramadzkaj i palityčnaj pracy nikoli nie abminaŭ bielarusaŭ i stała padčyrkivaŭ, što bielarusam u polskaj dziaržavie dzieilasia vialikaja kryŭda. U sudovym pracesie ŭ 1936 h. prakuror zakidaŭ navat S. Jendrychoŭskamu, što jon z svaimi tavaryšami i z KPZB imknuŭsia siłaj žmianić ład u Zachodniaj Bielarusi i adarvać jaje ad polskaj dziaržavy. Dasiulešniaja dziejnaść S. Jendrychoŭskaha daje padstavy dumać, što jon i ŭ novych abstavinach i ŭ litoŭskim Sojmie budzie pamiatavać ab bielarusach i baranić intaresaŭ ludziej pracy.

Łatvys-Fridman Berel—nar. ŭ 1904 h. u Rosienskim vokruzie. Dyplomavany praŭnik Za revalucyjnuju dziejnaść byŭ šeść razoŭ karany. U apošnim času dva razy padrad byŭ vysłany u aboz prymusovaj pracy ŭ Padbrodździ. Užo 8 hod jość dziejnym siabram kamunistyčnaj partyi. Ciapier źjaŭlajecca paŭnamocnikam Centralnaha Kamitetu partyi ŭ Vilni.

Dziewicka-Štachelska Irena. Radziłasia ŭ 1911 h. i stała žyła ŭ Vilni. Tut-ža skončyła lekarski addziel U S.B. Na akademickim hruncie naležała da Sajuzu Niezaležnaj Sacyjalistyčnaj Moładzi i da Hramadzkaha Klubu Medykaŭ, biaručy dziejnaje ŭčaście ŭ studenckim žyćci. Supracoŭničała ŭ hazetach „Poprostu" i „Karta" u dzialancy hramadzka-lekarskaj. U 1936 h. była abvinavačanaj u pracesie „studenckaj levicy". Była apraŭdana. Pa skančeńni U S.B. była asystentkaj dziciačaj kliniki U S.B. Apošnim časam pracuje ŭ Procisuchotnym Tavarystvie. Da času zakryćcia bolšaści arhanizacyjaŭ u Vilni litoŭskimi ŭładami viała biblijateku i čytalniu tavarystva rabotnickaha universytetu.

Budienovas Ihnat — nar. ŭ 1917 h. u Rasiei, rasiejskaj nacyjanalnaści, rabotnik i ciaślar.

Dahetul słužyŭ u vojsku ŭ Vilni. Ad 1935 h. da 1937 h. siadzieŭ u vastrozie za abaronu pravoŭ narodu. U vojsku dziejna pracavaŭ siarod žaŭnieraŭ i za heta byŭ praśledavany fašystaŭskimi elementami. Jahonym starańniem byli pryviedzieny na vieča 7 h. m. žaŭniery 1-ha pałka piechaty.

Vołkovič Stanisłaŭ — nar. ŭ 1894 h. Rabotnik. Skončyŭ pačatkavuju školu. Prasiadzieŭ 6 hadoŭ u vastrozie i niekalki razoŭ byŭ karany administracyja i vysyłany ŭ aboz prymusovaj pracy.

Micejka Maryjan — nar. ŭ 1911 h. Lićvin, stalar. Za pracu ŭ rabotnickim ruchu ŭ 1932 h. byŭ aryštavany i prasiadzieŭ u vastrozie da 1938 h. Pa vychadzie z vastrohu iznoŭ biare dziejny ŭdziel u ruchu prafesijanalnych sajuzaŭ dy revalucyjnym ruchu až da apošnich dzion.

Romuald Juknevičius —artyst, režyser, nar. ŭ 1906 h. u Pieciarburzie. Baćki pachodziać z Suvalščyny. U 1918 h. viarnuŭsia ŭ Litvu i skončyŭ u Koŭnie Vyšejšuju Handlovuju Školu, a pastupiŭšy na universytet prasłuchaŭ na humanistyčnym addziele kurs historyi Litvy. U 1933 h. skončyŭ aktorskuju školu. U 1935 h. vyjechaŭ u Maskvu, dzie ŭ praciahu dvuch sezonaŭ studyjavaŭ režyseryju ŭ teatrach Vachtanga, Meyerholda i „Tram". U Maskvie skončyŭ režyserski kurs V.T.O. U 1936—1939 h. pracavaŭ jak režyser i aktor u dziaržaŭnym teatry ŭ Kłajpedzie, paśla pieraniośsia ŭ Koŭna. Niadaŭna ź naznačany dyrektaram stvoranaha ŭ Vilni dziaržaŭnaha teatru.

Vacłaŭ Jadzgievič — nar. ŭ 1898 h. u Švianciansklim paviecie. Prabyvaŭ niejki čas u Ryzie, paśla ŭ Švianciansch i ŭ Vilni. U 1936 h. ustupiŭ u Kamunistyčnuju Partyju Zachodniaj Bielarusi, dzie byŭ až da jaje raźviazańnia. Pracavaŭ u roznych vilenskich fabrykach i ŭ 1936 h. byŭ staršyniaj Klasavaha Sajuzu Budaŭlanych Rabotnikaŭ u Vilni.

„Трэба направіць сацыяльнае зло"!..

Гэтыя словы напісаў на сваіх сьцягох новы ўрад Літоўскай Рэспублікі, і гэтыя словы паставіў у аснову сваей дэкляацыі цяперашні Прэзыдэнт і Прэм'ер-Міністр Рэспублікі Юстын Палецкіс. Вялікія, сьвятыя словы.

З гэным лёзунгам заўсёды ішлі і йдуць паўстаўшыя супроць сваіх эксплёататараў працоўных. Вось чаму новы ўрад знайшоў агульнае спачуцьцё і падтрыманьне ў шырокіх народных масах дзяржавы. Беларускі Народ, які нямала адчувае сацыяльнага зла, з радасьцю вітае тых, хто гэнае зло хоча направіць. Найвялікшае зло зьяўляецца тады, калі хтось, карыстаючыся са сваіго сацыяльнага і палітычнага палажэньня накідвае каму чужую ідэолёгію, калі нават змушае адмовіцца ад свайго нацыянальнага „я". А гэта пры старым урадзе здаралася.

Беларусы, якія жывуць у Віленшчыне, нярaз змушаліся запісвацца ў ліцьвіны. Выдаваліся пашпарты, у якіх беларус па волі чыноўніка станавіўся ліцьвіном. Каму было патрэбна гэнае калечаньне, каму было патрэбна вырываць глыбокую яму паміж двух братніх народаў, якія дагэтуль жылі паміж сабой у згодзе, як два братнія народы?

Лёгка пасеяць нязгоду, але як цяжка спыніць яе! А трэба зазначыць, што беларускае грамадзянства спаткала літоўскую ўладу надта прыхільна, лічыла яе блізкай сабе, амаль што ня роднай.

Не так даўно нашая інтэлігенцыя дружна жыла з інтэлігенцыяй літоўскай. І адну і другую цісну́ў озонаўска-шовіністычны польскі ўрад. Цяжка было! Бо і ліцьвіны і беларусы ў панскай Польшчы лічыліся грамадзянамі самага апошняга гатунку, фактычна ня маючы ніякіх палітычных і грамадзкіх правоў. Гэная нядоля ў панскай Польшчы абеднывала і ліцьвіноў і беларусаў, а паміж інтэлігенцыяў абыдвух народаў была прыязьнь і дружба.

Кароткае ў нас панаваньне папярэдняга л. шовіністычнага ўраду шмат што папсула ў гэнай доўгалетняй беларускалітоўскай дружбе; многія з нашай інтэлігенцыі апынуліся ў дужа цяжкім палажэньні.

А чаму? Ды таму, што беларускі народ — гэта сяляне і работнікі, ды таму, што нашая інтэлігенцыя — сыны гэных самых сялян і работнікаў. Вось чаму на розных пасадах пазасталіся „паны" з даўнейшага абозу, а беларусу нідзе месца ня было. Шмат надаралася „сацыяльнага зла" ў нас, і новаму ўраду трэба моцна папрацаваць, каб яго спыніць. У гэтай працы з боку беларускай інтэлігенцыі, беларускіх сялян і работнікаў заўсёды знойдзе ён зразуменьне і падтрыманьне.

Верым, што беларускія дзеці будуць вучыцца ў беларускіх школах і што нашай інтэлігенцыі і работнікам адчыніцца цяпер дарога да працы. Тады братнія нашы народы дружна прыймуцца за адбудову агульнага дабрабыту, сацыяльнай роўнасьці, і свайго шчасьця ў сваей супольнай дзяржаве.

Інтэлігент

UVAHA PADPIŠČYKI!

Usich padpiščykaŭ „Krynicy" z Vilni, a tak-ža i z pravincyi, katoryja akuratna zapłacili padpisku za „Krynicu" za 1940 hod da 1 maja sioleta, prosim pastaracca zajści ŭ redakcyju—Vilnia, Zavalnaja 1-2 — u časie ad 8 da 15 hadziny i zabrać pryznanuju im premiju za akuratnaść.

Administracyja „Krynicy"

Z hazet

Baraćba z šovinizmam

„Краснае знамя“, a taksama i „Gazeta Ludova“ ŭ № 7 z 5.VII. siol. razhladajuć vielmi aktualnuju spravu baraćby z nacyjanalnym šovinizmam, jaki na vilenskim miešanym abšary chočuć vykarystać u sučasnaj rearhanizacyi hramadzkaha žyćcia na svaju karyść roznyja vorahi narodu. Voś-ža sprava ŭ tym, kab usie prychilniki narodnaje ŭłady staralisia i nie padpadalisia henym voraham narodu, dy kab nie dapuścili ichniaje pravakacyjnaje raboty da narodnych masaŭ. U suviazi z hetym pravilna „Gazeta Ludowa“ piša, što:

„Treba pamiatavać, kab zmahajučysia z šovinizmam inšaha narodu nie paddavacca radzimaj šovinistyčnaj prapahandzie, kab usim zvaročvać uvahu na prajavy šovinizmu ŭ svajej sobskaj nacyjanalnaj hrupie i prynamsi raŭnalehła z joj zmahacca tak, jak z prajavami čužoha šovinizmu.“

Pry tym „Gazeta Ludova“ zajaŭlaje, što:

„Polskaje nasielnictva Vilni nie paddasca pravakacyi polskich šovinistaŭ i ćviorda stanie vobak zmahajučahasia za svaju volnuju i ščaślivuju budučyniu narodu litoŭskaha, vobak Žydoŭ, Biełarusaŭ i inšych narodnaściaŭ, žyvučych u hetym kraju“.

Što pryvioz premjer Kreve-Mickevičius z Maskvy

Supracoŭnik hazety „Tiesa“ zviarnuŭsia da vykonvajučaha abaviazki premjera i ministra zahraničnych spraŭ praf. V. Krėvė-Mickevičiusa z pytańniem:

— Što možacie skazać, Pavažany Ministar, ab metach i vynikach svaje padarožy ŭ Maskvu?

— Była heta — adkazaŭ Premjer — kurtuazyjnaja vizyta. Karystajučy-ž z hetaj akazii, abhavorana sprava jašče bolšaha rasšyreńnia ekanamičnych adnosinaŭ miž SSSR i Litvoj. Spatkańnie ŭ Maskvie było vielmi sardečnaje i ciopłaje. Jak zboku savieckich uładaŭ, tak i z boku savieckaha ahułu vyjaŭlenaje było žyvoje zacikaŭleńnie Litvoj i zrazumieńnie našych patrebaŭ. Aprača hetaha adviedaŭ ja ŭsie cikavyja miascy ŭ Maskvie i sielskahaspadarčuju vystaŭku, jakaja zrabiła na mianie vialikaje ŭražańnie.

ACHVIARY

Na Biełaruski Nac. Fond:

H. Šutavičanka 2 lity, St. M. 5 l., Karniuk A. 2 l., Novik Z. 2 l., Jehier A. 2l.

Što čuvać na frontach i ŭ palitycy

Jak my ŭžo pisali, u sučasny mament **vysoŭvajecca napierad** na mižnarodnaj arenie sprava Bałkanaŭ, ci lepš kažučy **sprava Rumynii, ab losach jakoj idzie narada ŭ viedamym Miunchienie.** U naradzie henaj pryjmajuć udzieł kancler Hitler, ministry zahraničnych spraŭ Niamieččyny i Italii Ribbentrop, Čiano, a tak-ža premjer Madziarščyuy Teleky i ministr zahraničnych spraŭ Csaky, Vyniki henaje narady, kali pišam hetyja słovy, jašče niaviedamyja.

Na zachadzie Eŭropy novaj źjaŭlajecca viestka ab tym, što *niamieckaje vojska pierajšło hranicu Hišpanii i znachodzicca u specyjalnych miascoch. Sama Hišpanija znachodzicca byccam na piaredadni abvieščańnia vajny Anhlii.* U suviazi z hetym *treba spadziavacca niamiecka-hišpanskaj ataki na Gibraltar.* Vialikuju sensacyju vyklikała viestka ab tym, što byccam *Švecyja dała niemcam dazvoł pieravozić praz svaju terytoryju ŭ Narvehiju* i nazad u Niamieččynu vojska i roznyja tavary. Z hetaha asabliva niezadavoleny anhlijcy.

Na frontach choć bolšych źmienaŭ niama, usio-ž *pałažeńnie Anhlii pahoršvajecca.* Pierad usim *nia ścichajuć kanflikty miž anhlickaj i francuskaj flotai. Dalej zavastrajucca adnosiny Anhlii z Japonijaj*, jakaja hrazić užo anhlijcam zbrojnaj akcyjaj na Dalokim Uschodzie, kali jany nia strymajuć pieravozu vajennych materyjałaŭ praz Birmu i Hongkong u Kitaj. *Sajuz-ža Paŭdniovaj Afryki, jaki byŭ pad anhlickim upłyvam, vyskazaŭsia za separatystyčnym miram z Niamieččynaj i Italijaj.* U Amerycy vajennyja nastroi słabnuć i *nadzieja na toje, što Ameryka ŭmiašajecca ŭ vajnu ŭ Eŭropie źmianšajucca.* Havorać užo i ab tym, što Anhlii moža nie chapić paliva. Bo niemcy, katorym anhlijcy starajucca bambardavać zborniki nafty i benzyny ŭ hetki samy sposab adpłačvajucca Anhlii.

U Francyi źmieniena ŭžo kanstytucyja ŭ kirunku fašystaŭskim i marš. Petain'a kirujuć francuskija nacyjanalisty na dyktatara. *Niemcy i italjancy*, jak pišuć hazety, *starajucca ŭciahnuć Francyju ŭ fašystoŭski svoj blok, jaki achapłaŭ-by Niamieččynu, Italiju, Japoniju i Francyju.* Marš. Petain choča byccam stvaryć vialiki blok łacinski, u jaki ŭvachodzili-b Francyja, Hišpaniju i Italija, a dziela taho, što hetyja dziaržavy katalickija, jany pryciahvali-b da siabie niamieckija katalickija pravincyi: Aŭstryju i Bavaryju.

Rep.

VOKAM PA ŚVIECIE

U Juhasłavii vielmi radasna spatkali pieršaha dyplomatyčnaha pradstaŭnika SSSR, katory anahdaj pryjechaŭ tudy. U Biełhradzie adbylisia vialikija manifestacyi, u časie jakich natoŭp pracoŭnych i studentaŭ damahaŭsia vajskovaha sajuzu Juhasłavii z SSSR.

Pieršaja sesija Najvyšejšaj Rady Kareła-Finskaj Savieckaj Sacyjalistyčnaj Respubliki na staršyniu Rady vybrała Otto Kuusinen.

Aŭtanamičnaja Sav. Sac. Respublika Małdavii maje być novaj Savieckaj Sacyjalistyčnaj Respublikaj, da jakoje budzie dałučana Biesarabija. Namier hety vyklikaje vialikuju radaść siarod małdaŭcaŭ.

Nutranaja pazyka ŭ SSSR prachodzie niazvyčajna ŭdała. Za pieršych piać dzion vykuplena było ablihacyjaŭ na sumu 5 miljardaŭ 580 miljonaŭ rubloŭ.

Kamisar metalurhii SSSR Samachvałaŭ zvolnieny. Jahonyja abaviazki dalej budzie vykonvać Łomakaŭ.

Abisynski karol-negus Haile Selassie znachodzicca ŭžo ŭ Abisynii. U stalicy Abisynii m. Adis-Abebie vybuchła paŭstańnie suproć Italii.

Kartki na pradukty buduć chutka ŭviedzieny ŭ Francyi, choć zapasy zbožža, miasa, tłuščaŭ, vina jość vialikija i hoład Francyi nie hrazić.

Francyja mahła jašče vajavać, jak padajuć hazety, ale francuskija nacyjanalisty na čale z hien. Weygand bajalisia narodnaj revalucyi bolš, čymsia pieramohi Hitlera i dziela taho pajšli Hitleru na ŭstupki, padpisvajučy mir.

Francyja sarvała dyplomatyčnyja znosiny z Anhlijaj. Uradaŭcy z francuskaha pasolstva ŭ Londanie vyjechali ŭ Francyju.

Rumynski premjer Gigurt skazaŭ pramovu, u jakoj zajaviŭ, što novy ŭrad u palitycy nutranoj budzie pravodzić antysemityzm, a ŭ zahraničnaj abaprecca na haspadarstvy vosi — Niamieččyny i Italii. Rumynija ŭžo vystupiła z Lihi Narodaŭ.

Japoncy ŭ suviazi z 3-mi ŭhodkami vajny z Kitajem padali, što jany u časie kanfliktu na hranicy Mandžuryi i Manholii źbili 1.340 savieckich samalotaŭ i 30 źnistožyli na ziamli. „Tass" zapiarečvaje hetyja viestki, nazyvajučy ich biespadstaŭnymi i śmiešnymi i padaje, što ad 15.V.1939 h. da 15.XI h. h. japoncy stracili 660 samalotaŭ, a Saviety ŭ Manholii 143.

Draudimo A/B „KOOPERACYJA“

pieraniasłosia ŭ Vilni z vul. Hiedymina 22

na vul. Hiedymina 19 kv. 3 tel. tel. 3-41 i 31-66

Žyćcio ŭ Vilni i Kraju

Novyja zastupniki Načalnika miesta Vilni i pavietu. 9 h. m. zvolnieny dasiulešnija zastupniki načalnika m. Vilni i pavietu — Draugelis i Noakas. Na ich miesca naznačany: 1-šym zastupnikam Jury Damaševičius, a 2-him Vilhelm Dudelis.

Dla rehulacyi płaty za pracu stvorana specyjalnaja Kamisija koštaŭ pracy, u skład jakoje ŭvachodziać pa 1 pradstaŭniku z ministerstvaŭ: pracy, skarbu i ziemlarobstva i 2 pradstaŭnikoŭ prafesyjanalnych sajuzaŭ. Biaz viedama hetaj kamisii zabaroniena padvyžšać płatu za pracu, źmianiać paradak vypłataŭ. Chto choča źmianić isnujučyja normy płaty ci paradak vypłataŭ pavinny padać adpaviednuju zajavu ŭ Kamisiju rehulacyi płaty za pracu praz prafesyjanalny sajuz ci praz miascovaha inspektara pracy.

Kamisija ŭstanaŭlajučaja pravy da hramadzianstva ŭ Vilni ŭžo źlikvidavanaja. Punkty vydavańnia pašpartaŭ časova začynieny. Fakty hetyja źviazany z zahadam ab vybarach u Sojm, jaki dajučy prava hołasu ŭsim žycharom Vilni i vokruhu, katoryja žyli da 1.IX.1939 h., faktyčna ŭsim dasiulešnim h. zv. čužaziemcam pryznaŭ hramadzianstva Litvy i źlikvidavaŭ padzieł žycharoŭ Vilenščyny na hramadzian i čužaziemcaŭ.

Karty pracy, ci jak inakš ich nazyvali, dazvoły na pracu, tym asobam jakija nia mieł litoŭskich pašpartaŭ, zhodna z zahadam načalnika m. Vilni i pavietu adklikany i bolš ich nidzie nia buduć vymahać.

Delehatury rabotnikaŭ pry inspekcyi pracy buduć chutka ŭstanoŭleny z pradstaŭnikoŭ ad rabotnikaŭ z paasobnych halinaŭ promysłu.

Zvolnieny ŭsie vučyciali relihii zhodna z zahadam ministra aśviety ad 1 lipnia sioleta ŭva ŭsich siarednich škołach (himnazijach i prohimnazijach).

Z Vilenskaha mahistratu zvolnieny praŭny radnik Juchnievičius, sakratar Baliunas, kiraŭniki Gražulis i Burokas.

Mahistrat m. Vilni kuplaje ad švajcarskaje supałki „Arbon" 31 aŭtabusaŭ, jakija jeździli ŭ Vilni, za ahulnuju sumu 79,000 litaŭ.

Pavysić płatu za rabotu rabotnikam na 20 pracentaŭ dazvoliła kamisija acenki pracy. U pieršuju čarhu pavinna być pavyšana płata rabotnikam nižejšych katehoryjaŭ.

Zabaroniena pradavać alkaholnyja napitki z pryčyny vybaraŭ u Sojm 12, 13, 14 i 15 lipnia sioleta.

Nie pieravialičać zahadu ab baraćbie z nistožańniem žyvoha inventara — voś žadańnie departamantu promysłu i handlu. Heta značyć, što ministerstva skarbu vostra zabaraniaje zabivać hatunkovuju, zavodnuju, rasovuju skacinu, ale nie zabaraniaje pradavać, jak nie katoryja zrazumieli, zbožža, masła, miasa, siena, skaciny i h. d. u ramkach narmalnaje pradažy, što jość navat kaniečnaje, kab ziemlaroby nia źmienšvali dastavy na rynak.

Užo pačalisia

PRYHATAVAŬČYJA KURSY

da ekzaminaŭ uva ŭsie klasy Biełaruskaj Prohimnazii.

Zainteresavanyja karystajcie z akazii. Dakładnyja infarmacyi ab kursach možna atrymać u kancylaryi Prohimnazii (Vilnia, Daminikanskaja 3 5) ad 10-12 hadz. štodzień z vyniatkam sierady.

Leidėjas ir Redaktorius: ADOLFAS KLIMOVIČIUS Telefon u drukarniu i redakcyju 28-32. Fr. Skarynos vardo Gudų Spaustuvė, Vilnius, Pylimo g-vė 1
Vydaviec i Redaktar: ADOLF KLIMOVIČ Biel. Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, vul. Zavalnaja 1

Valstybinė Vrublevskių ... VILNIUS